# «КУЛЬТУРА СТВАРАЕЦЦА ЧАЛАВЕКАМ І СТВАРАЕ ЧАЛАВЕКА»: ТАЦЦЯНА ПЕСНЯКЕВІЧ

**Т. У. Малмыга**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*– Таццяна Пятроўна, апошнія 20 гадоў вашай журналісцкай работы на радыё звязаны з радыёканалам «Культура». Вы, можна сказаць, адна з першых яго супраўнікаў. Я ведаю, што вы ўдзельнічалі ў прамым эфіры першага дня вяшчання. Памятаеце, як гэта было?*

– Добра памятаю настрой таго дня: святочна ўсхваляваны. Першы дзень Новага 2002-га года, невялікая ўтульная студыя прамога эфіру новага канала Беларускага радыё, канала «Культура», прэзентацыя музычнага праекта «Ars longa, vita brevis» («Жыццё кароткае, мастацтва вечнае»). У студыі аўтар праекта – Алег Барысавіч Залётнеў, выдатны беларускі кампазітар, інтэлектуал, чалавек высокай культуры і разнастайных творчых інтарэсаў. Мы вядзем гутарку пра музыку розных эпох і стылёвых накірункаў, узгадваем славутых кампазітараў мінулага і дзеячаў культуры, якія ствараюць сённяшні музычны партрэт Беларусі, гартаем старонкі беларускай музычнай спадчыны, а потым выпраўляемся ў падарожжа па славутых канцэртных залах свету і слухаем сусветнавядомых спевакоў і інструменталістаў. І гучыць музыка: ад класікі да папулярнай. Затым прадстаўляем рубрыкі: «Мелодыі з календара», «Аўтограф», «Старонкі беларускай музычнай спадчыны»… Адчуванне, быццам гартаем эксклюзійны музычны часопіс з гукавым прыкладаннем. Гэта быў цікавы праект працягласцю 2 гадзіны 20 хвілін, які выходзіў па нядзелях на працягу новага эфірнага сезона.

*– Напачатку канал «Культура» павінен быў толькі рэтранслява-ць фонды Беларускага радыё. І, найперш, музычныя. Тыя, хто працаваў на той час на Чырвонай, 4, і я ў тым ліку, бачылі, як вы разам з калегамі насілі горы стужак на эфір. Тады алічбоўка вытворчага радыйнага працэсу яшчэ толькі пачыналася. Але адна справа прынесці плёнкі і зусім іншая структурыраваць эфір. Думаю,без вас тут не абыйшлося, бо менавіта супрацоўнікі былой, на той час, музычнай рэдакцыі ведалі, як гэта рабіць. Што было найбольш складаным?*

– Структурыраваць эфір – гэта значыла так размясціць у сетцы вяшчання музычныя перадачы, каб яны давалі магчымасць слухачам сустрэцца з рознай музыкай адпаведна разнастайным слухацкім густам, захапленням, узроўню адукаванасці. І трэба аддаць належнае першаму дырэктару канала «Культура» Кацярыне Іванаўне Агеевай, якая вельмі тонка паставілася да фарміравання музычнай палітры эфірнага дня, падтрымала цікавыя прапановы і праекты музычных рэдактараў. Адзінае, што найбольш хвалявала на пачатку – гэта, каб падчас эфіру не парвалася стужка з музычным творам. А іх у канцэртах было звычайна ад пяці і больш.

*– Ведаю вашу любоў да народнай музыкі. Зараз вы робіце перадачу «Гасцінец». Раскажыце, як стваралася гэта праграма? У чым яе ідэя, хто ўдзельнікі і слухачы?*

– Мае стасункі з традыцыйным беларускім фальклорам пачаліся яшчэ на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Існавала такая перадача «Радыёклуб “Фальклор”», ля вытокаў якой былі нашы знакамітыя этнамузыколагі Зінаіда Якаўлеўна Мажэйка і Тамара Барысаўна Варфаламеева. Потым да іх далучылася Іна Дзмітрыеўна Назіна. Мне даверылі падхапіць гэту «фальклорную эстафету». І прыемна, што многія сённяшнія прафесійныя выканаўцы беларускай народнай музыкі, збіральнікі фальклору кажуць, што іх цікавасць да нацыянальнага фальклору пачыналася менавіта з перадачы «Радыёклуб “Фальклор”». Перадача «Гасцінец» стваралася на канале «Культура» як музычна-пазнавальная праграма для аматараў народнай музыкі. Разлічана на слухачоў розных узростаў, музыкантаў-прафесіяналаў і аматараў. Спачатку ў ёй гучалі беларускія старадаўнія народныя песні, танцы, найгрышы, а таксама аўтарскія творы з выкарыстаннем фальклору, традыцыйная музыка народаў свету. На эфір запрашаліся этнамузыколагі і выканаўцы. А затым канал «Культура» пачаў удзельнічаць у міжнародных музычных праектах «Каляды» і «Вялікдзень», «Песні кахання», «Калыханкі». У праграме «Гасцінец» гучалі цудоўныя фальклорныя ўзоры з розных краін свету. Станоўчым момантам у папулярызацыі нацыянальнага фальклору сталі фальклорныя экспедыцыі па Беларусі. І зноў хачу падзякаваць першаму дырэктару канала «Культура» К. І. Агеевай за падтрымку гэтай ідэі. Паездкі для запісу рэдкіх узораў старадаўняга беларускага музычнага фальклору адбыліся

ў Любанскі, Салігорскі, Жыткавіцкі, Столінскі, Лельчыцкі, Расонскі і Ваўкавыскі раёны. І сёння песні, танцы, найгрышы, легенды, паданні, прытчы, запісаныя ў тых экспедыцыях, можна слухаць у праграме «Гасцінец».

*– На канале ёсць яшчэ адна праграма пра народную музыку – «Беларуская этнафонія». Вашы інтарэсы перасякаюцца?*

– Пакуль перасячэння інтарэсаў не назірала. Думаю, не перасякаюцца, бо інтарэс у нас агульны – гэта беларускі фальклор у мностве форм яго сучаснага існавання. Таму цікава ўсё: і захаванне старажытных традыцыйных абрадаў, і знаёмства з музычнымі групамі, якія выконваюць апрацаваны і неапрацаваны фальклор. «Гасцінец» робіць акцэнт на захавальнай функцыі, звяртаецца да вытокаў, узгадвае легендарных аўтэнтычных беларускіх спевакоў і музыкантаў, чые запісы захоўваюцца ў залатым фондзе радыё. «Беларуская этнафонія» прэзентуе слухачам сучаснае жыццё старадаўніх традыцый.

*– Вы з’яўляецеся вядучай адной з лепшых, на мой погляд, музычных праграм «Канцэртная зала». Гэтая перадача ў эфіры ці не з першых дзён існавання канала. Я ведаю, што ідэя яе стварэння належала кампазітару Віктару Кісценю, які на той час працаваў на канале «Культура». Зараз гэтую праграму рыхтуеце вы і Алесь Вольша. Чым яна выдзяляецца і чым прыцягвае вас?*

– «Канцэртная зала» – праект, які адкрывае перад слухачамі магчымасць віртуальнай прысутнасці на цікавых нацыянальных і міжнародных музычных імпрэзах. За час існавання канала «Культура» гэта праграма выходзіла ў розных фарматах: гэта і прамая трансляцыя з Вялікай студыі Дома радыё з прысутнасцю слухачоў, гэта і канцэрт-прэм’ера асобнага твора, гэта і канцэрт-прэзентацыя нацыянальных і замежных салістаў-вакалістаў, інструменталістаў, дырыжораў. У «Канцэртнай зале» можна паслухаць класічныя творы, этнамузыку, фолк, джаз у інтэрпрэтацыі як сусветнавядомых, так і маладых замежных выканаўцаў, трансляцыі канцэртаў з Беларускай дзяржаўнай філармоніі і іншых канцэртных пляцовак краіны. Ствараецца своеасаблівая музычная панарама нашага часу.

*– Якія яшчэ праекты на канале «Культура» ёсць у вашай капілцы?*

– Цяпер на канале «Культура», акрамя «Гасцінца» і «Канцэртнай залы», рыхтую праграмы «Амфітэатр», «З музычнай калекцыі ка-

нала «Культура», «Музыка ночы», «Для паўночнікаў». У асноўным, гэта музычна-пазнавальныя праекты, а праграма «Для паўночнікаў» – музычна-забаўляльная.

*– Як вядома, такія радыёстанцыі, як «Культура» разлічаны на дасведчаную, адукаваную аўдыторыю. І слухацкая аўдыторыя ў іх невялікая. На ваш погляд, што трэба памяняць у рабоце канала, каб прыцягнуць больш слухачоў? А можа ўвогуле нічога мяняць не трэба?*

– Мне падаецца, пакуль не настаў час рабіць штосьці спецыяльнае, каб павялічыць слухацкую аўдыторыю канала «Культура». Такія захады будуць выглядаць штучна. Не могуць усе слухачы быць аднолькава высокаінтэлектуальнымі, высокаадукаванымі, людзьмі з асаблівымі эстэтычнымі запатрабаваннямі. Трэба працягваць працаваць у разліку на аўдыторыю, якая жадае і ўгледзецца ў гісторыю, і даведацца аб новым у мастацтве, літаратуры, музыцы. І акцэнтаваць увагу на тым, што культура ствараецца чалавекам і стварае чалавека.

*– Якія пажаданні каналу і сабе ў гонар юбілею?*

– Канал «Культура» – гэта, перш за ўсё, супрацоўнікі, стваральнікі, як цяпер кажуць, кантэнту. Калісьці ў размове з К. І. Агеевай вызначылася аснова, на якой павінен трымацца канал. Яна ўяўляе сабой два крылы, адно сімвалізуе маладосць, другое – вопыт. Здавалася б, раўнавагі не атрымліваецца, маладосць – гэта лёгкасць, нястрымны палёт у вышыні; вопыт, на першы погляд, гэты палёт абмяжоўвае, стрымлівае. Але насамрэч менавіта ў раўнавазе маладосці і вопыту залог поспеху, у пераемнасці традыцый. Да гэтай пары не магу забыць словы чалавека, апантанага прагай стварыць штосьці суперновае на даўно вядомай эфірнай пляцоўцы: «Нам не патрэбны людзі, што абапіраюцца на кульбу досведу, якая перашкаджае ім узляцець». Дарэчы, тая яго прага нічым добрым не ўвянчалася. Каналу «Культура» жадаю захаваць гармонію маладосці і вопыту, без якіх немагчымы высокі творчы палёт. Усім супрацоўнікам – адкрыцця і паспяховага асваення новых цудоўных эфірных вышынь! І няхай нас не пакідае жаданне бачыць, адчуваць і ствараць Прыгажосць.